# Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы

Урок беларускай мовы. 9 клас

**А. М. Власавец,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска

**Мэты**:

– стварыць умовы для засваення вучнямі сэнсава-граматычных прымет складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы;

– выпрацоўваць уменні выяўляць складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы ў тэкстах; вызначаць межы галоўнай і даданай частак у складаназалежных сказах з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы, месца даданай часткі адносна галоўнай; выяўляць сродкі сувязі частак; вызначаць, што паясняе даданая частка, акалічнасныя сэнсавыя адносіны (часу, умовы) паміж галоўнай і даданай часткамі; будаваць схемы складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы;

– арганізаваць маўленчую сітуацыю для развіцця камунікатыўнай культуры вучняў, агульнавучэбных уменняў працаваць з вучэбным дапаможнікам, аналізаваць, параўноўваць, рабіць вывад;

– актуалізаваць веды вучняў аб правапісе *і, ы, й* пасля прыставак;

– выхоўваць павагу да літаратурнай спадчыны.

**Абсталяванне:** падручнік, выстава кніг Якуба Коласа, карткі з заданнямі, запісы на дошцы.

**Ход урока**

*Ён не паспеў аб нашым слаўным часе*
*Ўсяго сказаць, усіх паэм злажыць,*
*Пайшоў пясняр, а песня засталася,*
*Памёр паэт, а песня будзе жыць!*

Сяргей Грахоўскі

**I. Арганізацыйны момант**

**II.Праверка дамашняга задання**

Выбарачная праверка выкананага задання.

**Зварот да эпіграфа.** Давайце зачытаем гэтыя словы і вызначым, які сэнс яны заключаюць.

**Уступнае слова настаўніка.**

Ёсць людзі, якія прыходзяць на Зямлю як пасланцы нябёсаў і пакідаюць зорны след у вечнасці. Гэтыя людзі адзначаны Богам. З'яўленне на Зямлі ў **1882** годзе (*3 лістапада, мястэчка Акінчыцы, непадалёку ад горада Стоўбцы, памёр 13 жніўня 1956*) Якуба Коласа – гэта Божы дар беларускаму народу. Нястомны працаўнік, літаратар, усёй душой любіў родных людзей, родную зямлю – такім ён быў. Пасля заканчэння ў 1902 годзе Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі накіраваны на працу на Палессе, спачатку – у вёску Люсіна Ганцавіцкага раёна, потым – у Пінкавічы Пінскага раёна (1902-1904) *(дэманструецца здымак).* У 1912 годзе лёс зноў звязвае Якуба Коласа з Палессем, на гэты раз з горадам Пінскам. Да 1915 года ён працуе ў 3-й прыходскай школе *(дэманструецца здымак).* Палессе з'явілася для Коласа добрай жыццёвай школай. Менавіта палескія мясціны і палескія героі сталі ў цэнтры значнага твора пісьменніка – трылогіі «На ростанях», якая дае плённы

матэрыял для вывучэння тэмы сённяшняга ўрока: **Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы.**

**II. Актуалізацыя ведаў вучняў пра складаназалежныя сказы**

– Якія складаныя сказы называюцца складаназалежнымі?

– Назавіце асноўныя сродкі сувязі граматычных частак у складаназалежных сказах.

– Назавіце асноўныя віды даданых частак у складаназалежных сказах.

– Якія даданыя часткі з'яўляюцца даданымі азначальнымі? Дапаўняльнымі?

– Ахарактарызуйце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі.

**III. Інфармацыйны этап**

1. *Запіс і аналіз сказаў, пабудова схем.*

Як толькі канчалася работа ў школах, настаўнікі з'язджаліся на лета да бацькоў. *(Часу)*

Прападзеш, калі не выратуюць людзі.*(Умовы)*

Калі Лабановіч ішоў дадому, ён думаў аб сваёй нелегальнай рабоце і аб Вользе Віктараўне. *(Часу)*

2. *Работа з падручнікам.* Знаёмства з лінгвістычным матэрыялам §19 на стар. 88 – 89 падручніка.

- Назавіце сродкі сувязі даданых акалічнасных частак часу і ўмовы.

3. *Арфаграфічная размінка*

Вучням раздадзены карткі са словамі, у якіх трэба ўставіць прапушчаныя літары. Правільныя адказы дэманструюцца на экране, карткі правяраюцца ў парах.

Непры..мальны, ня..начай, пад..дзеш, пры..дзе, аб..сці, аб'..нець, без..дэйны, транс..тальянскі, за..сці, пера..маць, па..менна, пры..шоў, за..грыванне, за..кнуцца, аб..лгаць, раз..сціся, аб..мшэлы, контр..гра, за..нець, пра..снаваць, пра…нфармаваць, супер..нтэлектуальны, про..грыш

**IV. Адпрацоўка і карэкцыя ведаў**

1. Работа з практ. 127 праводзіцца па варыянтах. I варыянт выпісвае складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі ўмовы, II варыянт — з даданымі часу. Паставіць знакі прыпынку, пабудаваць схемы сказаў. Два вучні працуюць каля дошкі.

2.Работа вучняў па картках «Знайсці трэцяе лішняе» і растлумачыць:

*I рад (тыпы сказаў)*

1. Лабановіч – так звалі маладога настаўніка – слухаў апавяданне з вялікай цікавасцю. *(трэцяе лішняе - просты сказ)*

2. Яму вельмі падабаліся такія гутаркі з гэтымі простымі мі, якія яшчэ так мала адышліся ад часоў першапачатковай людской культуры.

3. І нейкі востры боль адчуўся ў сэрцы маладога настаўніка, а вобраз Ядвісі яшчэ яскравей устаў у яго вачах.

*II рад (віды складаных сказаў)*

1. Бо прырода – найцікавейшая кніга, якая разгорнута прад вачамі кожнага з нас.

*2.* Апошні раз расступіўся лес, і перад вачамі настаўніка раскрылася шырокая круглая палянка, вясёлая і прыветная. *(трэцяе лішняе – складаназлучаны сказ)*

3. Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс – чалавек і прырода.

*III рад (від даданых частак у складаным сказе)*

1.Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазвінела песня ляснога жаваранка. *(трэцяе лішняе – даданая азначальная частка)*

2.Ён устаў, калі ўжо ў школе чуліся дзіцячыя галасы.

3.Калі падняцца на вапельную гару…, то перад вамі разгорнецца найпрыгажэйшая панарама.

**Хвіліна адпачынку**

(Праводзіцца невялікая гутарка пра асобу Якуба Коласа, звяртаецца ўвага на выставу кніг пісьменніка. Гучыць на памяць верш).

**Тамара Лазнюха**

***Якубу Коласу***

Не ўспрыняўшы жыццёвай халтуры,
Праўдай твораў у сэрцы пранік.
Ён – пясняр беларускай культуры
І духоўны яе прадстаўнік.

Чалавек добра ведаць павінен
Роднай мовы сапраўдны выток.
І праводзяцца каласавіны,
Што вітаюць наш любы куток.

Ёсць усё: дуб з развесістай кронай,
Паляшук – думных дзён справавед…
Горад Пінск, вёска з нізкім паклонам
Праслаўляюць Настаўніка след.

3.Работа з тэкстам. *(Вызначыць стыль, тып і мэтанакіраванасць тэксту. Абгрунтаваць свае меркаванні.)*

Дарога павярнула ўлева, пайшла грудамі, шчыльней тулячыся да Нёмана, дзе ён апісваў вельмі зграбную луку, падыходзячы да лесу. Уся гэта лука выглядала пышным старасвецкім садам, дзе замест пладовых дрэў раслі разложыстыя, дуплястыя, з асмаленымі жараламі дубы, убраныя чорнымі шапкамі буславых гнёздаў. Часамі гэтыя гнёзды, заціснутыя ў развіліны стромкіх аголеных шпянёў, высока ўзнятых над зялёнаю каронаю дуба, што пачынаў сохнуць зверху, здаваліся нейкімі дзіўнымі падвескамі над дубамі,

бо самыя шпяні скрадваліся адлегласцю і губляліся ў празрыстых хвалях паветра.

-*Знайсці складаназалежныя сказы ў тэксце, вызначыць галоўную і даданую часткі, сродкі сувязі граматычных частак.*

**Фізкультхвілінка**

4.Работа з дэфармаванымі сказамі ( па варыянтах).

*Уставіць замест кропак патрэбныя па сэнсе злучнікі і злучальныя словы, паставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаназалежнага сказа.*

1. Яшчэ не бачаныя краявіды Пінскага Палесся, залітыя святлом верасвнёўскага сонца, атуленыя тонкаю павалокаю сінечы, поўныя своеасаблівага хараства, першабытнай дзікасці,мяккасці тонаў і нейкай адвечнай задумлёнасці, выпікалі перад Лабановічам, захаплялі сваімі чарамі, неабсяжнымі прасторамі зямлі і роўняддзю паземаў … зліваюцца з небам ці хаваюцца за цёмна-сіняй стужкаю бясконца далёкіх лясоў. *( што).*

2. Настаўнік падыходзіць да пераезда, паварочвае ўправа ў лес і выходзіць на дарогу … ідзе на станцыю з яго вёскі. *(што).*

3. Ён чуў … моцна звязан ён з жыццём. *(як)*

4. Яшчэ раз азірнуўся назад … пад'язджалі да лесу.*(як)*

5. Багата і шчодра ўпрыгожыла вясна зямлю, адзеўшы яе з..лянінаю, ярыною і жытамі … пачыналі ўжо выпускаць маладзенечкія каласочкі . *(што).*

**V. Падагульненне**

**Выніковы тэст.**

I варыянт

I. Адзначце нумары складаназалежных сказаў.

*1. Каб любіць Беларусь маю мілую, трэба ў розных краях пабываць…*

(А. Ставер).

*2.Як чорны парасон, вісела цемра над зямлёй* (М. Калачынскі).

*3.Спіць у зялёным бары цішыня, толькі закаханым не спіцца* (А. Бачыла).

*4. Бо прырода – найцікавейшая кніга, якая разгорнута прад вачамі кожнага з нас* (Я. Колас ).

5. *Першыя часы побыту дома Лабановіч хадзіў па полі, што яны арандавалі, аглядаў засевы збожжа.* (Я. Колас).

II.Адзначце нумары сказаў з даданай азначальнай часткай.

*1.Чакаюць верасы і каласы, каб зноў азону і дажджу напіцца* (Г. Бураўкін).

*2.Лабановіч адчуваў у сэрцы журботу аб Палессі, па тых вобразах, што далёка засталіся ззаду.* (Я. Колас).

*3. Гэта было адзінае месца, дзе можна было хадзіць, не баючыся гразі* (Я. Колас).

*4. З таго краю лесу, дзе рос алешнік, выплыў туман* (М. Дубоўскі).

*5. Напярэдадні ад’езду пайшоў Лабановіч у лес, каб апошні раз агледзець свае грыбныя абходы і развітацца з імі.* (Я. Колас).

III. Адзначце нумары сказаў з даданай дапаўняльнай часткай.

1. *Пра тое, што чакала яе ў мястэчку, Саша не думала (*І. Шамякін).

2.*Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс, і хараство – чалавек і прырода* (Я. Колас).

3. *Археалагічныя раскопкі сведчаць, што на тэрыторыі Беларусі вытворчасць шкла існавала ўжо ў III-IV стагоддзях* («Полымя»).

*4.Значэнне пісьменніка залежыць ад таго, наколькі яго творчасць выяўляе душу і лёс народа* ( І. Мележ).

*5. Паэзія – нібы крыніца, што не з зямлі, а з сэрца б’е* (П. Броўка).

IV. Адзначце нумары сказаў з пунктуацыйнай памылкай.

*1. Лабановіч са сваёй групай зразу павярнуў у поле каб межамі дайсці да лесу (*Я. Колас).

*2. Узышоўшы на самы высокі пункт мясціны, Лабановіч спыніўся каб вокам акінуць ваколіцы.* (Я. Колас).

*3.Хоць ён меў ужо даволі значную школьную практыку, тым не меней першая сустрэча з вучнямі ў новай школе і цікавілі і трохі хвалявала.*

(Я. Колас).

*4. І сам Лабановіч стаў гарачым і адданым прыхільнікам і прапагандыстам свайго роднага слова на якім друкавалася газета* (Я. Колас).

5**.** *Дзверы ў пакой расчыніліся з такой незвычайнаю сілаю і грукнулі ў сцяну так, што пасыпаўся тынк.* (Я. Колас).

II варыянт

I. Адзначце нумары складаназалежных сказаў.

*1. Як чмель над кветкай, ля крыніцы струменьчык чысценькі цурчэў.*

(У. Дубоўка).

*2.Па меры таго, як выкладаў Сцёпка свой план, слухачы ўсё больш захапляліся ім*. (Я. Колас).

*3. Наперадзе як кінуць вокам цягнулася шэрая пожня і чорная ралля*

(К. Чорны).

*4. На станцыі ён даведаўся дакладна, калі прыходзіць пасажырскі поезд на Мінск…* (Я. Колас).

*5. Усё пакінуць след павінна, бо, як пачаўся белы свет, прамень, пясчынка і расінка нязменна пакідаюць след* (П. Броўка).

II. Адзначце нумары сказаў з даданай дапаўняльнай часткай.

1. *Пасля такіх спрэчак сябры адчулі, што іх сяброўства дало вялікую расколіну…*(Я. Колас ).

2.*Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс і хараство – чалавек і прырода* (Я. Колас).

3. *Археалагічныя раскопкі сведчаць, што на тэрыторыі Беларусі вытворчасць шкла існавала ўжо ў III-IV стагоддзях* («Полымя»).

*4.Значэнне пісьменніка залежыць ад таго, наколькі яго творчасць выяўляе душу і лёс народа* (І. Мележ).

*5. Паэзія – нібы крыніца, што не з зямлі, а з сэрца б’е* (П. Броўка).

III. Адзначце нумары сказаў з даданай азначальнай часткай.

*1.Чакаюць верасы і каласы, каб зноў азону і дажджу напіцца* (Г. Бураўкін).

*2. Мала выпадала такіх начэй, калі б можна было паспаць па-людску*

( І. Мележ).

*3. Гэта было адзінае месца, дзе можна было хадзіць, не баючыся гразі*

(Я. Колас).

*4. З таго краю лесу, дзе рос алешнік, выплыў туман* (М. Дубоўскі).

*5. Жыта красуе, дзе раней было непраходнае балота* (А. Асіпенка).

IV. Адзначце нумары сказаў, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна.

*1.Толькі на далёкай адлегласці можна адчуць, якая любоў да родных мясцін жыве ў чалавечым сэрцы* (А. Пальчэўскі).

*2. Пайшла б Ганна, куды вочы глядзяць* (І. Мележ).

*3. Настаўнік імкнуўся заўсёды трымаць сваіх вучняў у стане зацікаўленасці да таго, аб чым ён гаварыў, або чытаў.* (Я. Колас ).

*4. У лесе было так добра і так ціха, што нават прыкрая прыгода адышла на задні план* (Я. Колас).

*5. Не болей тыдня прайшло з таго часу, калі ён з'явіўся ў свае родныя мясціны.* (Я. Колас).

*Адказы.* І варыянт: І – 1,4,5; ІІ – 2,3,4; ІІІ – 1,3,4; IV – 1,2,4.

ІІ варыянт: І – 2,4,5; ІІ – 1,3,4; ІІІ – 2,5; IV – 1,4,5.

**VI. Рэфлексія**

Закончыце фразу «Сустрэча з асобай і творчасцю Якуба Коласа дапамагла мне зразумець, што …»;

**VII. Дамашняе заданне:** §19, практыкаванне 130. Паўтарыць правапіс вялікай і малой літар.